❄ **13 снежня** ў галерэі «Ракурс» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася выстава **«Зімовая»**, прымеркаваная да навагодніх свят. У экспазіцыі – жывапіс і графіка сучасных беларускіх мастакоў, работы якіх аб'яднаны агульнай тэмай – святочнай перадпавагодняй зімой. У розных тэхніках, манерах аўтары прадстаўляюць сваё бачанне адметнай пары года – казачнай і напоўненай марамі, поўнай надзей і ўсмешак. Выстава прадэманструе гледачам разнастайную панараму перадпавагодніх вобразаў, калейдаскоп святочных пажаданняў, традыцый, успамінаў і асацыяцый. Аматары Калядных гулянняў, цудаў Раства, выканання жаданняў у навагоднюю ноч змогуць памроіць і зарадзіцца выдатным настроем!

Выстава будзе працаваць да 27 лютага.